**25 лістапада 2024 г. - 115 гадоў з дня нараджэння Праскоўі Сямёнаўны Сідарук (1909-2001), удзельніка рэвалюцыйнага руху на Заходняй Беларусі, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, Ганаровага грамадзяніна горада Кобрына**



Праскоўя Сямёнаўна Сідарук нарадзілася 25 лістапада 1909 года ў в. Ілаўск Кобрынскага павета Гродзенскай губерні (цяпер Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці) у сялянскай сям'і.

Яе біяграфія - жыццёвая і працоўная - у многім тыпічная для заходніх беларусаў старэйшага пакалення, якія зведалі на сабе акупацыйны рэжым і панскі прыгнёт, з маладых гадоў уключаліся ў вызваленчую палітычную барацьбу.

У доме Сідарукоў у 1925 годзе была адкрыта так званая рабоча-сялянская бібліятэка, дзе замест дазволеных цэнзурай кніг аб «добрых» панах і «шчаслівых» сялянах чыталі літаратуру, якая тайком дастаўлялася з усходу, расказвалі вясковым юнакам і дзяўчатам аб новым жыцці, аб неабходнасці змагацца за новае жыццё. Разам з братам, членам КПЗБ Ігнатам Сямёнавічам, Праскоўя Сідарук прымала актыўны ўдзел у падпольным руху за вызваленне Заходняй Беларусі з-пад улады Польшчы, была непасрэдным удзельнікам вераснёўскіх падзей 1939 года на Кобрыншчыне.

Да 1928 года працавала ў гаспадарцы бацькоў, наступныя чатыры гады была работніцай у швейнай майстэрні ў Кобрыне. З 1927 года Праскоўя Сідарук - член камсамола Заходняй Беларусі, у 1931 годзе ўступіла ў кампартыю Заходняй Беларусі. Вяла прапагандысцкую работу сярод насельніцтва, стварала падпольныя ячэйкі ў вёсках, збірала сродкі для палітзняволеных, арганізоўвала чыткі забароненай літаратуры, распаўсюджанне лістовак, вывешванне чырвоных флагоў, транспарантаў.

За палітычную дзейнасць і прыналежнасць да КПЗБ Праскоўя Сідарук у 1932 годзе была асуджана да двух гадоў турэмнага зняволення. Пасля кароткага знаходжання на волі, у 1935 годзе, зноў стала палітвязнем у польскай турме, дзе

знаходзілася да 1939 года. Вясковая дзяўчына, яна была на рэдкасць адважнай і свабодалюбівай. Актыўная падпольная дзейнасць, распаўсюджванне нелегальнай літаратуры, праца з людзьмі - і арышты, допыты, турмы.

Пасля вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 годзе П. С. Сідарук актыўна ўключылася ў наладжванне новага жыцця. Нейкі час загадвала дзіцячым садком у Кобрыне. У кастрычніку 1939 года была абрана дэпутатам Народнага сходу Заходняй Беларусі, што праходзіў ў Беластоку, галасавала за ўз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР.

У 1940 годзе П. С. Сідарук апынулася ў Паволжы. Пераехала ў Саратаўскую вобласць, дзе да 1943 года працавала старшынёй сельскага Савета ў мястэчку Гарадзец, падлікоўцам у калгасе «20 гадоў Кастрычніка».

У 1943 годзе П. С. Сідарук становіцца курсантам спецшколы ў Маскве, пасля заканчэння якой у студзені 1944 года перакінута на акупіраваную фашыстамі тэрыторыю Беларусі ў распараджэнне Брэсцкага падпольнага абкама партыі для арганізацыі падпольнай і партызанскай барацьбы. Была інструктарам Антопальскага падпольнага райкама КП(б)Б, які знаходзіўся ў партызанскім атрадзе імя Кірава. Вяла вялікую растлумачальную работу сярод насельніцтва, заклікала да барацьбы з акупантамі, з-за чаго не раз была на краю гібелі. Жыхары многіх вёсак былога Антопальскага і Кобрынскага раёнаў памяталі яе палымяныя выступленні, якія ўсялялі веру ў перамогу.

Пасля вызвалення Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў Праскоўя Сямёнаўна шмат працавала па аднаўленні разбуранай гаспадаркі, наладжванні мірнага жыцця. У 1944 годзе кароткі час была трэцім сакратаром Антопальскага РК КП(б)Б. З 1944 па 1946 год з’яўлялася слухачом партшколы пры ЦК КПБ у Мінску.

Пасля заканчэння партшколы і да 1948 года загадвала аддзелам па рабоце сярод жанчын Кобрынскага РК КП(б)Б. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР другога склікання (1947–1951). З 1948 па 1953 год - трэці сакратар Кобрынскага райкама КП(б)Б. У 1953 годзе Праскоўя Сямёнаўна пераходзіць на савецкую работу і на працягу шасці гадоў працуе намеснікам старшыні Кобрынскага райвыканкама.

У 1959 годзе П. С. Сідарук выйшла на пенсію, але яшчэ шмат гадоў прымала актыўны ўдзел у грамадскім жыцці горада і раёна. Была членам партыйнай камісіі пры гаркаме КПБ,

членам савета ветэранаў, членам камісіі па ахове помнікаў. Яе гутаркі і ўспаміны аб мінулым, аб барацьбе з ворагамі Савецкай улады ўважліва слухалі школьнікі і дарослыя, вучыліся ў яе стойкасці, адданасці і вернасці Радзіме, свайму народу. З 1969 года Праскоўя Сямёнаўна - персанальны пенсіянер рэспубліканскага значэння.

За баявыя заслугі ў Вялікай Айчыннай вайне, працоўную дзейнасць П. С. Сідарук адзначана шматлікімі ўзнагародамі: ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «Партизану Отечественной войны» I ступені, «За доблестный труд. В ознаменование 100-летия со дня рождения Владимира Ильича Ленина» (1970), «Сорок лет Победы в Великой Отечественной войне 1941–1945 гг.» (1985) і інш., знакам «Партизан Белоруссии». У сувязі з 60-годдзем БССР і Кампартыі Беларусі ўзнагароджана ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР (1979).

Высокую ацэнку працы П. С. Сідарук далі і кабрынчане, удастоіўшы яе ў 1964 годзе звання «Ганаровы грамадзянін горада Кобрына» (рашэнне Кобрынскага гарадскога выканкама № 203 ад 18.07.1964).

Праскоўя Сямёнаўна Сідарук памерла 2 чэрвеня 2001 года на 92-м годзе жыцця**.**

*Матэрыял падрыхтаваны ў 2019 г., дапоўнены ў 2024 г.*
*Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай.*
*Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф*
*аддзела абслугоўвання і інфармацыі*

### Працы, успаміны П. С. Сідарук

**Сідарук, П. С.** Рабочая гвардыя КПЗБ : у летапіс народнай славы / П. С. Сідарук, І. С. Сідарук // Камуністычная праца. – 1981. – 7 ліпеня (№ 81). – С. 2-3.

**Сідарук, П. С.** Горад Кобрын : у летапіс славы / П. С. Сідарук, І. С. Сідарук // Камуністычная праца. - 1980. - 13 мая (№ 58). - С. 2-3.

**Сідарук, П. С.** З палымяным словам партыі / П. С. Сідарук // Камуністычная праца. - 1980. - 9 мая (№ 57). – С. 2.

Камуністы Кобрыншчыны не толькі вялі прапагандысцкую работу, але і самі прымалі актыўны ўдзел у баявых аперацыях.

**Сідарук, П. С.** І паднялася хваля гневу / П. С. Сідарук, І. С. Сідарук // Камуністычная праца. - 1980. - 8 ліпеня (№ 82).

Кобрыншчына ў 1905-1907 гг.

**Сідарук, П. С**. Мужнелі ў барацьбе / П. С. Сідарук, І. С. Сідарук // Камуністычная праца. - 1980. - 12 жніўня (№ 97). - С. 2.

Кобрыншчына ў 1917-1918 гг.

**Сідарук, П. С.** Мы падымаем сцяг … «Правда» несла нам праўду / П. С. Сідарук, І. С. Сідарук // Камуністычная праца. – 1980. - 6 снежня. – С. 2.

Успаміны ўдзельніцы рэвалюцыйнага падполля, Ганаровага грамадзяніна горада Кобрына, персанальнай пенсіянеркі П. С. Сідарук.

**Сідарук, П. С.** Яны былі першымі / П. С. Сідарук, І. С. Сідарук // Камуністычная праца. - 1980. - 28 жніўня.

Аб стварэнні першых органаў Савецкай улады на Кобрыншчыне.

**Сідарук, П. С.** Крокі часу / П. С. Сідарук, І. С. Сідарук // Камуністычная праца. – 1978. – 28 снежня (№ 156) ; 1979. – 1 студзеня.

Да 60-годдзя з дня ўтварэння БССР.

**Сідарук, П. С.** У тыя векапомныя дні : [да 60-годдзя Вялікага Кастрычніка] / П. С. Сідарук, І. С. Сідарук // Камуністычная праца. - 1976. - 28 снежня. - С. 2,3.

**Сідарук, П. С.** На абарону Радзімы / П. С. Сідарук, І. С. Сідарук // Камуністычная праца. - 1974. – 29 чэрвеня (№ 78). – С. 1.

Да 30-годдзя з дня вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

**Сідарук, П. С.** У барацьбе за свабоду і шчасце : да 50-годдзя КПЗБ / П. С. Сідарук, І. С. Сідарук // Камуністычная праца. - 1973. – 27 кастрычніка (№ 129). – С. 3.

**Сідарук, П. С.** Мы заставаліся непахіснымі / П. С. Сідарук, І. С. Сідарук // Камуністычная праца. - 1970. – 21 красавіка (№ 48). – С. 2, 3.

**Сідарук, П. С.** Мы заставаліся непахіснымі / П. С. Сідарук, І. С. Сідарук // Камуністычная праца. - 1970. - 21 красавіка (№ 48). - С. 2, 3.

Кобрыншчына ў перыяд 1918-1939 гг.

## Аб жыцці і дзейнасці П. С. Сідарук

**Долготович, Б. Д.** Сидорук Прасковья Семеновна / Б. Д. Долготович // Почетные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. - Минск, 2008. – С. 32-33.

**Сідарук Праскоўя Сямёнаўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 455. – (Яны кіравалі горадам і раёнам).

**Сідарук Праскоўя Сямёнаўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 292. - (Яны прайшлі дарогамі вайны).

**Сідарук Праскоўя Сямёнаўна** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2020. – С. 28-29 : фат.

**115 гадоў** з дня нараджэння П. С. Сідарук (1909-2001) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021–2025 гг. / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2020. - С. 132.

**Чирун, А.** 1905 год на Кобринщине как один из предвестников Великого Октября / Александр Чирун // Кобрынскі веснік. - 2022. — 5 лістапада (№ 85). — С. 9 : фот.

О революционных событиях на Кобринщине 1905—1907 гг. из воспоминаний П. С. Сидорук.

**Чирун, А**. БССР или Польша: развитие или путь в никуда / по материалам Кобринского военно-исторического музея им. А. В. Суворова ; Александр Чирун // Кобрынскі веснік. – 2022. – 21 верасня (№ 72). – С. 5 : фот.

Статья написана на основе рукописи «Непокоренная Кобринщина», составленной в 1967 г. И. С. Сидоруком и П. С. Сидорук.

**Курачук, С.** История кобринского края в лицах. Почетный гражданин города Кобрина. Ф. М. Алисиевич, П. С. Сидорук, Л. М. Сандалов, Д. К. Борисов, И. М. Подберезин / страницу подготовила Светлана Курачук // Кобрин-информ. – 2021. – 25 марта (№ 12). – С. 4.

**Курачук, С.** Достойным - почётное звание! / Светлана Курачук // Кобрин-информ. – 2018. – 6 декабря (№ 49). – С. 4.

В рамках проекта Кобринской центральной районной библиотеки издан биобиблиографический справочник «Імі ганарыцца Кобрыншчына» и создана полнотекстовая база данных «Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю».

**Белов, Д.** Сквозь аресты и тюрьмы ... / Д. Белов // Кобрынскі веснік. – 2009. - 11 сакавіка. - С. 3.

Активным участником событий воссоединения Западной Белоруссии с БССР была П. Сидорук, почётный гражданин города Кобрина.

**Праскоўя Сямёнаўна Сідарук** // Кобрынскі веснік. – 2002. – 20 ліпеня. – (Кобрына Ганаровыя грамадзяне).

**Сідарук Праскоўя Сямёнаўна** : [некралог] // Кобрынскі веснік. – 2001. – – 9 чэрвеня. – С. 4 : фат.

**Хільчук, М.** Па закліку сэрца / М. Хільчук // Камуністычная праца. – 1984. – 24 лістапада. - С. 3.

Ганароваму грамадзяніну г. Кобрына П. С. Сідарук – 75 гадоў.

**Суворов, А.** Рассказ третий: из родника революции / А. Суворов, А. Цвыд ; фото Е. Макарчук // Заря. – 1987. – 3 июля (№ 127). – С. 3 : фот.

Из воспоминаний П. С. Сидорук.

**Сяргей, А.** З партбілетам ля сэрца : [П. С. Сідарук] / А. Сяргей // Камуністычная праца. - 1982. -16 верасня.

**Борисовец, А.** Бесстрашная : [П. С. Сидорук] / А. Борисовец // Заря. - 1979. - 3 июля.

**Віншуем** з сямідзесяцігоддзем! / фота Г. Краснова // Камуністычная праца. – 1979. – 24 лістапада (№ 141). – С. 3.

25 лістапада спаўняецца 70 гадоў з дня нараджэння Праскоўі Сямёнаўны Сідарук.

**Сидорук Прасковья Семеновна** // Список почетных граждан города Кобрина / отдел идеологической работы Кобринского исполкома. – Кобрин, 2002. – С. 2.

**О награждении** Почетной грамотой и Грамотой Верховного Совета Белорусской ССР ветеранов гражданской и Великой Отечественной войн, активных участников социалистического строительства Сидорук Прасковью Семеновну : Указ Президиума Верховного Совета Белорусской ССР // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 186. Оп. 1. Д. 675. Л. 102.

**О награждении** юбилейной медалью «За доблестный труд. В ознаменование 100-летия со дня рождения Владимира Ильича Ленина» Сидорук Прасковью Семеновну : постановление Брестского обкома КПБ, исполкома Брестского областного Совета депутатов трудящихся, президиума областного Совета профсоюзов, 27 марта 1970 г., № 58-а // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 4. Оп. 1. Д. 594. Лл. 1, 8, 9, 54, 55, 78, 80, 88.

**Список** награжденных юбилейной медалью «Сорок лет Победы в Великой Отечественной войне 1941-1945 гг.» Сидорук Прасковья Семеновна // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 186. Оп. 4. Д. 104а. Лл. 7, 8, 11.

**Список** по награждению юбилейной медалью «За доблестный труд. В ознаменование 100-летия со дня рождения Владимира Ильича Ленина» пенсионеров - рабочих, служащих, инвалидов Великой Отечественной войны. Сидорук Прасковье Семеновне // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 186. Оп. 1. Д. 286. Лл. 51, 53.

**Список** партизан и подпольщиков г. Кобрина и Кобринского района для вручения знака «Партизан Белоруссии» // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 186. Оп. 4. Д. 103а. Лл. 1, 3.

Кобрынскі раён
Кобрын
Ілаўск
Сідарук Праскоўя Сямёнаўна
Удзельнікі рэвалюцыйнага руху
Удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны
Падпольшчыкі
Партызаны
Ганаровыя грамадзяне